На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

№ 72(654)
Субота, 24 красавіка 1999 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Кошт: у кіёсках і крамах — 10000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля





ТРЫНАЦЦАЦЬ ТРАГІЧНЫХ ГАДОЎ ПАСЛЯ ЧАРНОБЫЛЯ

У беларускім календары 26 красавіка назаўсёды застанецца памечаным у чорны колер. У гэты дзень 13 гадоў таму ў 1 гадзіну 24 мінуты на чацвёртым энергаблоку Чарнобыльскай АЭС пры яго планавым спыненні адбылася самая буйная тэхнагенная катастрофа.

Так званая актыўная стадыя аварыі працягвалася 10 сутак, на працягу якіх адбываліся надзвычай інтэнсіўныя выкіды радыеактыўных рэчываў. Канчатковае ж "дыханне" ядзернага вулкана было спынена толькі ў лістападзе 86-га года пасля ўзвядзення над чацвёртым энергаблокам саркафага. Цяпер пад ім знаходзяцца сотні тон насычанага радыяцыяй металу, урану, бетону і шклопадобнай масы, а таксама радыеактыўнага пылу з агульнай актыўнасцю больш як 2 мільёны Кюры. Да гэтага часу аб'ект "Укрыццё" — так афіцыйна называецца гэта страшнае захаванне — тоіць у сабе патэнцыяльную пагрозу. Вучоныя мала ведаюць аб працэсах, якія адбываюцца ўнутры саркафага, паколькі высокі ўзровень радыяцыі не дае магчымасці нават наблізіцца да яго. А тым часам, ужо неаднаразова ў свідравінах, прабураных вакол, у падглебавых водах выяўляюцца радыеактыўныя ізатопы. Ды і сам саркафаг паступова разбураецца: ён пакрыты шматлікімі, да сотні метраў, трэшчынамі.

Больш страшнай катастрофы па маштабах бедства, па цяжкасці наступстваў чалавецтва яшчэ не ведала. Радыеактыўнае воблака распаўсюдзілася на дзесяткі тысяч кіламетраў, сляды Чарнобыля знаходзілі нават у Аўстраліі. Але больш за ўсё бед выпала на долю Беларусі: забруджванню падвергнулася больш як 46 тысяч квадратных кіламетраў тэрыторыі рэспублікі, што складае амаль чацвёртую яе частку. Ад катастрофы пацярпеў кожны пяты жыхар краіны — амаль 2 мільёны чалавек, сотням тысяч людзей давялося пакінуць абжытыя мясціны і шукаць прытулку ў іншых месцах. Аднак і да гэтага часу на забруджаных радыенуклідамі тэрыторыях у 2906 населеных пунктах пражываюць звыш 1,6 мільёна чалавек.

Маштабы трагедыі маглі быць меншымі, калі б з самага пачатку ўлады не ўтойвалі сапраўдную карціну таго, што здарылася. Але ў той жа час, наступствы катастрофы маглі б быць непараўнальна большымі, калі б не мужнасць і гераізм ліквідатараў аварыі. Цаной уласнага здароўя, а нярэдка і жыцця яны абаранялі іншых ад ядзернага смерчу. Паводле даных МНС Расіі, са 160 тысяч беларускіх ліквідатараў больш як 5 тысяч памерлі, звыш 25 тысяч сталі інвалідамі. Вялікі ўрон катастрофа нанесла здароўю жыхароў забруджаных тэрыторый. Паводле ацэнак спецыялістаў, у выніку апрамянення ў Беларусі, Расіі і на Украіне памерлі звыш 300 тысяч чалавек. У нашай краіне ў постчарнобыльскі перыяд адбыўся рэзкі ўсплёск захворванняў, у тым ліку анкалагічных, сардэчна-сасудзістых, псіхічных хвароб, захворванняў унутраных органаў. Праўда, некаторыя эксперты, перш за ўсё замежныя, схільныя звязваць гэты працэс з пагаршэннем сацыяльна-эканамічных умоў жыцця. Адзінае захворванне, сувязь якога з Чарнобылем не выклікае сумненняў ні ў кога, — рак шчытападобнай залозы ў дзяцей. У Нацыянальным дакладзе, выдадзеным у канцы мінулага года, прыводзяцца такія даныя: за 12 гадоў пасля катастрофы колькасць дзяцей, хворых на рак шчытападобнай залозы, павялічылася ў 71,7 раза. Калі ў 1974—1985 гадах выпадкаў гэтага захворвання было ўсяго 8, то ў 1986—1997 гадах — ужо 574.

Наступствы катастрофы вялікім цяжарам ляглі на эканоміку нашай краіны. Урон, нанесены Беларусі, ацэньваецца ў 235 мільярдаў долараў ЗША, што роўна 32 рэспубліканскім бюджэтам 1985 года. Цяпер у Беларусі рэалізуецца ўжо трэцяя па ліку дзяржаўная праграма, накіраваная на вырашэнне чарнобыльскіх праблем. Яе адрозненне ад папярэдніх ў тым, што ў ёй упершыню ўзнята пытанне аб неабходнасці правядзення рэабілітацыі населеных пунктаў, размешчаных на забруджаных тэрыторыях. У мінулым годзе на рэалізацыю праграмы з дзяржбюджэту было накіравана 12,4 трыльёна рублёў, што дало магчымасць прафінансаваць усе намечаныя мерапрыемствы. За гэтыя сродкі будаваліся аб'екты сацыяльнага і вытворчага прызначэння, пракладваліся газа- і водаправоды, 2 трыльёны рублёў было накіравана на правядзенне комплексу ахоўных мерапрыемстваў.

У гэтым годзе на правядзенне чарнобыльскіх мерапрыемстваў ў бюджэце прадугледжана 37 трыльёнаў рублёў, што складае 7,8 працэнта ад яго расходнай часткі. 11 трыльёнаў з іх будзе накіравана на капітальныя ўкладанні, а 19 — на выкананне закона аб сацыяльнай абароне грамадзян. Адна з асноўных задач гэтага года — завяршыць праграму будаўніцтва жылля для перасяленцаў. Пад асаблівы кантроль узята вырашэнне праблемы забеспячэння ўсіх жыхароў забруджаных радыенуклідамі тэрыторый чыстай пітной вадой.

Калі раней кожная гадавіна аварыі за мяжой адзначалася "ўсплёскамі актыўнасці" спецыялістаў, якія праводзілі шматлікія канферэнцыі, сімпозіумы і семінары, то апошнім часам трагічная дата праходзіць менш прыметна. Прычыны гэтага самыя розныя, у тым ліку і "стомленасць" замежных партнёраў ад праблем Чарнобыля, і палітычныя супярэчнасці паміж Беларуссю і краінамі Захаду. Няправільна ўспрынялі за мяжой і рэарганізацыю Дзяржкамчарнобыля, палічыўшы, што калі мы ліквідавалі гэта ведамства, значыць, усе чарнобыльскія праблемы вырашаны. У канцы мінулага года ў адпаведнасці з указам прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ў складзе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях створаны Камітэт па праблемах наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Цяпер у яго кампетэнцыі знаходзяцца пытанні, звязаныя з сацыяльнай абаронай грамадзян, рэабілітацыяй забруджаных тэрыторый, аздараўленнем насельніцтва, развіццём міжнародных сувязей, правядзеннем навуковых даследаванняў.

Адной з бліжэйшых задач камітэта, паводле слоў яго старшыні Івана Keніка, з'яўляецца распрацоўка і прыняцце новых гранічна дапушчальных узроўняў утрымання радыенуклідаў у прадуктах харчавання, якія плануецца значна знізіць. Бо, напрыклад, на Украіне норма ўтрымання ізатопаў у мясе ў тры разы меншая, чым у нас. Увядзенне новых гранічна дапушчальных узроўняў запатрабуе дадатковых расходаў, бо для гэтага прыйдзецца больш строга прытрымлівацца тэхналогіі сельскагаспадарчай вытворчасці, уносіць дадатковыя дозы мінеральных угнаенняў. Але толькі так можна зрабіць айчынныя прадукты харчавання больш бяспечнымі. Дарэчы, менавіта з высокім узроўнем утрымання ў іх радыенуклідаў беларускія спецыялісты звязваюць тое, што ў пацярпелых раёнах захворванне на рак органаў стрававання ў два разы вышэйшае, чым у цэлым па рэспубліцы.

Эдуард ПІВАВАР, каментатар БелТА.



Удзельнікі шэсця "Чарнобыльскі шлях-98".

Фота IREX/ProMedia.

Пенсіі павялічацца, але ўсёроўна яны застануцца мізэрнымі

Як паведаміла карэспандэнту БелТА міністр сацыяльнай абароны Вольга Даргель, у маі пенсіі павялічацца ў сярэднім на 20 працэнтаў. Мінімальныя пенсіі павялічацца на 52 працэнты, і іх памер разам з даплатамі складзе 3 мільёны рублёў. Што ж датычыць максімальных пенсій, то іх памеры будуць адрозніваццa ў залежнасці ад таго, працуе пенсіянер або не. Гэта норма закладзена ў дзеючым з 1 красавіка дэкрэце прэзідэнта краіны, што даў магчымасць некалькі ўзмацніць дыферэнцыяцыю памераў пенсій у залежнасці ад ранейшага працоўнага ўкладу кожнага пенсіянера. Такім чынам, памер максімальных пенсій для пенсіянераў, якія працуюць, з 1 мая — 6 мільёнаў 675 тысяч рублёў, для непрацуючых — 9 мільёнаў 195 тысяч. Выключэнне складуць непрацуючыя шахцёры: памеры іх максімальных пенсій пры наяўнасці адпаведнага стажу павялічацца да 11 мільёнаў 616 тысяч рублёў.

Эдуард ПІВАВАР.

"Мінімалка" павысіцца ў два разы

Савет міністраў Беларусі прыняў пастанову "Аб павышэнні памеру мінімальнай заработнай платы і тарыфнай стаўкі першага разраду". У адпаведнасці з ёй з 1 мая 1999 года ўстанаўліваецца мінімальная заработная плата ў памеры 1 мільён рублёў, тарыфная стаўка першага разраду — у памеры 2 мільёны 150 тысяч рублёў для аплаты працы работнікаў бюджэтнай сферы. Работнікам бюджэтнай сферы, якія тарыфікуюцца 1—10 разрадамі, устанаўліваюцца штомесячныя даплаты ў памеры 1 мільён 700 тысяч рублёў.

Міністэрствам і іншым рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, кіраўнікам прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, што фінансуюцца з бюджэту, неабходна забяспечыць пераразлік заработнай платы работнікаў у адпаведнасці з устаноўленай гэтай пастановай тарыфнай стаўкай першага разраду і каэфіцыентамі Адзінай тарыфнай сеткі работнікаў Рэспублікі Беларусь.

Прадугледжаны пастановай і змяненні ў выплаце пенсій, стыпендый, дапамог.

З 1 мая гэтага года ў два разы павялічваюцца і назначаныя да названай даты ў адпаведнасці з заканадаўствам дапамогі па беспрацоўі і стыпендыі грамадзянам, якія праходзяць прафесійную падрыхтоўку (павышаюць кваліфікацыю) па накіраванні дзяржаўнай службы занятасці.

БелТА.

Закулисье

Зачем Ивану Ивановичу поручили проверить Ивана Ивановича

То, что не смогли сделать депутаты Верховного Совета 13-го созыва еще в тот период, когда белорусский парламент работал в полном составе, возможно, окажется по силам Контрольно-ревизионному управлению Министерства финансов. Именно этой организации поручено проверить финансовую деятельность Управления делами президента Республики Беларусь.

Напомним, что поручение Верховного Совета тогдашнему руководителю Контрольной палаты и депутату Василию Саковичу сделать ревизию управделами президента выполнено не было. Бывший главный контролер успел доложить только о начале расследований, а затем его подчиненным было отказано в праве знакомиться с документами всесильного ведомства Ивана Титенкова. Об этом Василий Сакович и доложил депутатам.

Что же изменилось за это время и почему вдруг стала возможна проверка? Ответ на вопрос прост: ее инициировал президент Лукашенко. С какой целью — об этом позже. А пока о том, как проходит ревизия. Все контролеры подчиняются заместителю министра финансов Ивану Ивановичу Заяшу (не путать с однофамильцем, который когда-то был заместителем председателя Нацбанка). Причем им рекомендовано строго соблюдать тайну проверок и отдавать все отчеты только Ивану Ивановичу.

Но контролеры ведь тоже живые люди и кое-что из их данных начинает просачиваться. Например, на реконструкцию знаменитых "Дроздов" после выселения оттуда иностранных послов уже потрачено два триллиона белорусских рублей. Для того чтобы ощутить, много это или мало, сошлемся на такой факт — говорят, что именно двух триллионов не хватает, чтобы, наконец, завершить реконструкцию Минского железнодорожного вокзала.

Известно и то, что с ведома управделами в тех же "Дроздах" использовалась очень дорогая импортная сантехника. Вспоминаю, что когда Юлия Чигирь, жена бывшего премьера Беларуси, на своей пресс-конференции называла значительные суммы, некоторые журналисты не верили ее данным. Теперь можно говорить, что Юлия Станиславовна неплохо знает ситуацию в "Дроздах".

А теперь о том, почему Александр Лукашенко вдруг решил проверить свое управление делами. Существует версия, что глава государства решил заменить Ивана Титенкова Владимиром Коноплевым. Однако Иван Иванович, по понятным причинам, не хочет покидать хлебное место. Возможно, после того, как он ознакомится с результатами проверки КРУ, Иван Иванович станет более сговорчивым.

Владимир ГЛОД.

Судом Маскоўскага раёна Брэста аштрафаваны кіраўнік мясцовага аддзялення праваабарончага цэнтра "Вясна-96"

На 10 мільёнаў рублёў аштрафаваны судом Маскоўскага раёна Брэста кіраўнік гарадскога аддзялення беларускага праваабарончага цэнтра "Вясна-96" Уладзімір Вялічкін за правядзенне несанкцыянаванага пікетавання.

21 лютага Вялічкін з плакатамі, на якіх было напісана "Не — Саюзу" і "16 траўня — выбары прэзідэнта", быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі на брэсцкім рэчавым рынку. Супраць яго ўзбудзілі справу па артыкуле 167, частка 1 Кодэкса аб адміністрацыйных праваларушэннях; вердыкт жа аб штрафе ў памеры 20 мінімальных зарплат быў вынесены брэстчаніну толькі пасля чатырох судовых пасяджэнняў. Уладзімір Вялічкін лічыць, што суд быў да яго несправядлівы і сваім рашэннем спрабаваў апраўдаць незаконныя дзеянні супрацоўнікаў міліцыі.

Валянціна КАЗЛОВІЧ, БелаПАН.

Гарэлка падаражэла на дзесяць працэнтаў

З 22 красавіка на дзесяць працэнтаў павысіліся цэны на гарэлку. Як паведамілі карэспандэнту БелТА ў Камітэце цэн, павышэнне звязана з папаўненнем даходаў у бюджэт і ў сувязі з тым, што некаторыя прадпрыемствы, якія вырабляюць гэты прадукт, сталі стратнымі.

БелТА.

Стыхія

Наламала бура "дроў"

Дванаццаць з семнаццаці сельскіх раёнаў Гродзеншчыны пацярпелі ад моцнай буры, якая пранеслася па тэрыторыі вобласці ў апошнія трое сутак.

Асабліва дасталася некаторым населеным пунктам Іўеўскага, Смаргонскага, Свіслацкага, Воранаўскага, Гродзенскага, Карэліцкага раёнаў. Паводле папярэдніх даных, у вобласці пацярпела 49 населеных пунктаў, а ў іх — больш за 380 пабудоў: жылых дамоў, сховішчаў, складскіх памяшканняў, механічных рамонтных майстэрань. Некаторыя населеныя пункты, жывёлагадоўчыя фермы і іншыя вытворчыя аб'екты часова засталіся без электраэнергіі. Матэрыяльны ўрон, нанесены стыхіяй, склаў амаль 36 мільярдаў рублёў. На шчасце, абышлося без чалавечых ахвяр.

Канстанцін БАЛАТЭВІЧ.

Надвор'е

24 і 25 красавіка па краіне захаваецца воблачнае з праясненнямі надвор'е; 24-га — на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень 25-га месцамі па краіне — дажджы. Вецер паўднёва-ўсходні, 4—9 м/с. Тэмпература паветра ўначы — +5...+10, удзень 24-га — +10...+15, 25-га — +12...+17.

Сустрэнемся на "Чарнобыльскім Шляху-99"

Дазволенае Мінгарвыканкамам шэсце адбудзецца 25 красавіка. Збор удзельнікаў "Чарнобыльскага Шляха-99" на сталічнай плошчы Якуба Коласа ў 12.30.

Шэсце пройдзе з 13.00 да 14.00 па праспекце Скарыны, вуліцам Я.Купалы і М.Багдановіча, праспекце П.Машэрава.

Мітынг — з 14.00 да 16.00 каля Палаца спорту.

Спорт

Киевляне и в третий раз до финала не дошли

В финале Лиги чемпионов, который пройдет 26 мая в Барселоне, встретятся германская "Бавария" и английский "Манчестер Юнайтед". К огромному сожалению многих болельщиков, решающий матч за самый престижный клубный евротрофей пройдет без динамовцев Киева. В ответном поединке в Мюнхене подопечные Валерия Лобановского уступили со счетом 0:1. Фантастический гол в ворота Александра Шовковского на 35-й минуте забил Марио Баслер.

Таким образом, третья в истории "Динамо" попытка пробиться в финал самого престижного евротурнира завершилась так же, как и две предыдущие, — неудачей. И винить киевлянам здесь некого, кроме самих себя. Дуэль с "Баварией" ими была проиграна еще в Киеве, где подопечные Валерия Лобановского, ведя по ходу игры 2:0 и 3:1, сыграли вничью 3:3.

Драматично складывались события в другом полуфинальном матче в Турине, где местный "Ювентус" принимал "Манчестер Юнайтед". Когда хозяева уже в дебюте матча повели со счетом 2:0 (дважды отличился Филиппо Индзаги), показалось, что итальянскому суперклубу четвертого подряд участия в финале Лиги чемпионов не избежать. Однако манкунианцы сумели-таки переломить ход встречи и вырвать победу — 3:2.

"Юность" потеснила стариков

В завершившемся первенстве Беларуси по хоккею свой очередной чемпионский титул уверенно завоевал гродненский "Неман". Обладатели других наград определились в матче последнего тура между минской "Юностью" и новополоцким "Полимиром", имевших одинаковое количество очков. Ничья 1:1 оказалась в пользу юных хоккеистов, оттеснивших опытных новополочан на третье место за счет лучшего соотношения игр между собой. Подопечные Михаила Захарова, впервые в своей истории завоевавшие серебряные награды чемпионата страны, к слову, никогда прежде в тройку призеров не входили. Некогда грозный столичный "Тивали" довольствовался четвертым местом.

Еврокубковый успех Андрея Климовца

Первый еврокубковый трофей в своей карьере завоевал линейный гандбольной сборной Бларуси Андрей Климовец. В составе немецкого "Фленсбурга-Хандевитта" он выиграл Кубок городов (четвертый по престижности клубный европейский турнир). Заметим, что белорусские гандболисты-легионеры, в отличие от представителей других игровых видов спорта, выступают на международной арене, пожалуй, наиболее успешно. Так, в минувшем году в составе австрийского "Хипо" женский Кубок чемпионов взяла Алла Васькова, а мужской Кубок кубков — Михаил Якимович из испанской "Кахи-Кантабрии". Еще раньше различными еврортрофеями владели игроки немецкой бундеслиги Геннадий Халепо и Андрей Синяк.

Дмитрий ЕРМАК.

Откроем глаза

Мечеслав ГРИБ, депутат Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва, координатор по наблюдению за выборами

Как в Беларуси проходили выборы в местные Советы

7 апреля 1999 г. президент Республики Беларусь в своем выступлении перед теми депутатами Верховного Совета, которые изменили Конституции 1994 года и вошли в так называемые палаты, заявил, что выборы депутатов местных Советов прошли успешно, в них приняло участие более 70 процентов избирателей, внесенных в списки для голосования. А.Лукашенко поблагодарил свою "вертикаль" за блестящую победу. Примерно такие же бравурные отчеты мы встречаем в официальных средствах массовой информации из уст председателя избирательной комиссии по выборам и проведению референдума и отдельных работников президентской "вертикали".

Но я считаю, что эта выборная эйфория, как и все официальные сообщения об успехах в экономике, политике, обороноспособности, есть попытки выдать желаемое за действительное. "Всеобщая любовь" к президенту иссякает на глазах и поддерживается беспрецедентным обманом.

Официальные данные показывают, что во время первого тура в Минске на избирательные участки пришли 48 процентов избирателей, Бресте — 51, Витебске — 52,4, Гродно — 60,3, Молодечно — 50,2, Жодино — 52,8, Борисове — 50,8, Новополоцке — 42 процента. В других крупных городах явка избирателей на избирательные участки, несмотря на всякие ухищрения и махинации "вертикальщиков", была на грани фола, т.е. 50 процентов, а ведь в крупных городах проживает большая часть избирателей страны. Необходимо учесть и то, что люди приходили голосовать не за депутатов местных Советов, а за политику президента.

Выборы проводились по закону "О выборах депутатов местных Советов Республики Беларусь" (от 15 декабря 1998 г.), который не соответствует нормам Международного права и демократическим стандартам цивилизованного мира, как я уже раньше рассказывал читателям газеты. Ряд статей этого Закона практически противоречит ныне действующей Конституции Республики Беларусь, несмотря на требования ст.137 Конституции, которая устанавливает, что "в случае расхождения закона или указа с Конституцией — действует Конституция". Но в данном случае действовал закон, а не Конституция — потому что так захотел и так повелел президент. Статьи 7, 33, 34, 36 закона противоречат статьям 37, 64, 65, 69 Конституции Республики Беларусь.

По заключению комиссии ОБСЕ, работающей в Минске, провести демократические, равные и справедливые выборы по этому закону невозможно. Но кого в Беларуси может интересовать мнение ОБСЕ?

Под благовидными и неблаговидными предлогами членами избирательных комиссий было отказано в регистрации кандидатами в депутаты представителям демократических партий и общественных движений, которые хотя бы чуть-чуть были заподозрены в нелояльности к политике президента Республики Беларусь. В результате на 24 570 депутатских мест разного уровня в стране претендовало 26 883 кандидата, конкурс составил 1,09, в районных городах — 1,3, в сельских советах — 1,01 кандидата на место. Словом, получилось что-то похожее на альтернативу Адама при выборе жены (помните, Бог привел к Адаму Еву и сказал: "Выбирай себе жену"). В абсолютном большинстве округов не было альтернативы кандидатам — сторонникам президента.

Казалось бы, белорусские власти сделали все возможное и невозможное, чтобы "вертикаль" обеспечила 100-процентную явку избирателей на избирательные участки и избрала угодных себе людей в первом туре голосования.

Однако так не произошло, и ряд избирательных комиссий, руководителей исполнительной власти пошли на нарушения закона и фальсификацию результатов выборов, превращая выборы в политический фарс. По материалам наблюдений за выборами во всех областях Республики Беларусь и в Минске, выборы проводились под беспрецедентным контролем исполкомов и администраций районов, представители которых беспардонно вмешивались в работу избирательных комиссий, фактически руководили ими, нарушая закон о выборах.

(Окончание на 2-й стр.)

Пр. Анціпа, Івана, Якава.
К. Аляксандра, Рыгора.

КРАСАВІК
24
'99 СУБОТА

Усход 5.48
Захад 20.28
Даўж. дня 14.40

Перш. квадра 22 красавіка
Захад 4.57
Усход 14.38

Пр. Афанасія, Васіля, Давыда, Зянона, Івана, Ісака, Міны.
К. Марка, Ярaслава.

СУСВЕТНЫ ДЗЕНЬ ПАРОДНЕНЫХ ГАРАДОЎ

КРАСАВІК
25
'99 НЯДЗЕЛЯ

Усход 5.46
Захад 20.30
Даўж. дня 14.44

Перш. квадра 22 красавіка
Захад 5.21
Усход 15.48

Откроем глаза

Как в Беларуси проходили выборы в местные советы

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Главной задачей исполкомов и администрации было обеспечение явки на избирательные участки 50 процентов от внесенных в списки для тайного голосования избирателей. Здесь события разворачивались в разных местах по-разному. Ст.3 закона "О выборах депутатов местных Советов" устанавливает, что "выборы являются свободными: избиратель лично решает участвовать ли ему в выборах и за кого голосовать". Эта норма закона была грубо нарушена, людей заставляли идти и голосовать под разными предлогами:

— в буфетах, организованных в помещениях при избирательных участках, была организована торговля крепкими спиртными напитками в розлив, торговля дефицитными товарами, продуктами питания (куриные яйца, сахар, сливочное масло, сыр и т.д.);

— агитаторы по нескольку раз в день ходили по квартирам, приглашали избирателей голосовать и объявляли о наличии дефицитных товаров в буфетах, которые к концу выборов могут окончиться, демонстративно записывали в свои блокноты номера квартир тех, кто отказывался от голосования;

— в ряде мест с открытия избирательных участков включались громкоговорящие установки, которые настойчиво приглашали избирателей на избирательные участки, мешая людям отдыхать в выходной день;

— в Витебске, Гродно, Гомеле настойчиво предлагали студентам техникумов и вузов проголосовать досрочно, в противном случае отдельным из них угрожали отчислением из учебных заведений. В конце дня 4 апреля были организованы специальные рейсы по студенческим общежитиям с целью выявления непроголосовавших студентов и доставки их на избирательные участки. Руководство учебных заведений сверяло списки студентов со списками избирателей в день выборов;

— в Витебске на отдельных предприятиях предупреждались рабочие, что если они не примут участия в голосовании, то не получат своевременно заработную плату. В отдельных колхозах выдавали заработную плату после того, как избиратель проголосует;

— в Солигорске перед выборами прошли встречи с рабочими, на которых подчеркивалась обязательность участия в выборах и предупреждалось, что списки тех, кто не проголосовал, будут представлены руководству их предприятий;

— в отдельных населенных пунктах Гродненской области утром 4 апреля 1999 г. руководители колхозов предоставили автобусы и автомашины и предлагали жителям отвезти их на богослужение в церкви и костелы. Жители соглашались на такие услуги, потому что католики в этот день праздновали Пасху, а православные — вербное воскресенье, но их сначала отвозили на избирательные участки, а потом к божьим храмам;

— военнослужащих избирателей приводили на избирательные участки строем, в обязательном порядке;

— всячески пропагандировалось и поощрялось досрочное голосование, без выяснения причин такого волеизъявления граждан. В Гродненской области досрочно проголосовало 24 процента избирателей, принявших участие в голосовании, за что губернатор Гродненской области получил благодарность от президента, хотя из этих 24 процентов избирателей в день выборов фактически никто никуда не выезжал. Ст.54 закона определяет одну возможность для досрочного голосования: "Избиратель, не имеющий возможности в день выборов находиться по месту своего жительства, вправе проголосовать досрочно", других причин закон не предусматривает.

На закрытых избирательных участках (в больницах, санаториях, Домах отдыха и т.д.) досрочно проголосовали от 20 до 40 процентов избирателей, хотя почти никто из них в день выборов никуда не выезжал.

Досрочное голосование, как и во время референдума 1996 г., и на этот раз стало палочкой-выручалочкой добровольно-принудительного голосования.

Наблюдатели, работающие во всех областях республики и в Минске, отметили массовые нарушения требований ст.55 этого закона о голосовании по месту нахождения избирателей:

— на избирательных участках в абсолютном большинстве не составлялись предварительные записи устных или письменных просьб об организации голосования по месту нахождения избирателей. Избирательные ящики досылались практически ко всем избирателям, проживающим в сельской местности, кто не проголосовал, без всяких заявлений;

— в Городокском районе Витебской области на отдельных участках голосование почти полностью проводилось по месту нахождения граждан;

— в Бресте после 13 часов 4 апреля исполкомами была дана команда подключить инициативные группы по приглашению избирателей на выборы. Агитаторы пошли по квартирам, а члены избирательной комиссии в отдельных микрорайонах города выносили избирательные ящики, устанавливали их на улицах и проводили голосование;

— в Минске в отдельных микрорайонах агитаторы обходили квартиры избирателей вместе с сотрудниками милиции. За нарушение ст.30 закона, в ряде мест искусственно уменьшалось количество избирателей, включенных в списки для голосования на разных участках и голосовало по нескольку раз:

— в нарушение ст.9 закона почти повсеместно на избирательные участки не допускались наблюдатели за выборами;

— в Витебской области фактически незаконно было отказано наблюдателям в организации наблюдения за проведением выборов в сельских районах;

— в Гомеле из 58 наблюдателей, допущенных к наблюдению за выборами с 1 апреля 1999 г., к концу выборов были незаконно отстранены от наблюдения 55 наблюдателей;

— в Могилеве отказали в регистрации 50 наблюдателям;

— избирательные комиссии по разным надуманным мотивам отказывались регистрировать наблюдателей от демократических партий и общественных организаций. В Минске для регистрации наблюдателя требовали наличие лицензии на оказание правовых услуг населению и разрешение Мингорисполкома. Наблюдателей под разными надуманными предлогами с помощью милиции удаляли из зала для голосования. Одного из них обвинили в том, что он молча, записывая что-то себе в блокнот, ведет агитацию против выборов;

— в Бресте сотрудник милиции, дежуривший на избирательном участке, перед окончанием голосования пригласил наблюдателя для краткой беседы за пределы комнаты голосования. Они беседовали не более 15 минут, но за это время количество проголосовавших увеличилось на 400 избирателей, хотя за весь день проголосовало только 500 избирателей.

Пользуясь поддержкой исполкомов и администрации, уверовав в свою безнаказанность, председатели избирательных комиссий в нарушение ст.13 и 25 закона отказывались принимать и регистрировать заявления, составленные общественными наблюдателями о нарушениях избирательного права при выборе депутатов местных Советов депутатов Республики Беларусь;

— в нарушение ст.53 закона почти повсеместно избирательные комиссии разрешали голосовать избирателям за других лиц, передавая в одни руки от двух до пяти бюллетеней. В городе Бресте на избирательном участке №31 было выдано дополнительно разным избирателям по предъявлению одного документа 153 бюллетеня, примерно 15 процентов от общего количества бюллетеней. Аналогичные нарушения зарегистрированы на всех избирательных участках.

В нарушение ст.56 закона в большей части проверенных участков нарушался принцип поочередного и раздельного вскрытия ящиков для досрочного голосования, переносных ящиков для голосования в день выборов. Все бюллетени сбрасывались на стол в одну кучу, а потом пересчитывались, что исключало возможность установить количество избирателей, проголосовавших досрочно и по месту нахождения избирателей, и создавало условия для злоупотреблений.

Почти на одной трети проверенных участков после окончания процедуры подсчета голосов участковые избирательные комиссии не вывесили копии протоколов подсчета голосов. В ряде мест протоколы подсчета голосов заполнялись карандашом. Председатели участковых избирательных комиссий сразу же доставляли протоколы подсчета голосов в исполком или в администрацию районов и кроме заполненных протоколов брали с собой и чистые бланки протоколов для подсчета голосов.

Неиспользованные бюллетени не всегда актировались и не всегда учитывались.

На одном избирательном участке в Витебском районе утром 5 апреля были обнаружены целые пачки неиспользованных бюллетеней, забытых комиссией после выборного банкета.

Боязнь присутствия общественных наблюдателей на выборах и устранения их с избирательных участков любыми способами говорит сама за себя и комментарии не требуются. Выборы в большинстве случаев были безальтернативными, и основным вопросом было не кто из кандидатов выиграет, а состоятся ли выборы вообще, беря во внимание 50-процентный порог. Эта цель достигалась любым путем. Организация данных выборов была аморальная, безнравственная, циничная в рамках правового Чернобыля, свойственного для Беларуси сегодняшнего дня. Демократические партии и общественные объединения, отказавшись участвовать в таких выборах, поступили честно и правильно. Нельзя принимать участия в игре, если правила этой игры диктуются только одной стороной, да и те нарушаются ими постоянно и в любое время.

27,1 працэнта прадпрыемстваў і арганізацый Беларусі стратныя

Па стане на пачатак сакавіка 1999 года ў Беларусі было 2 987 стратных прадпрыемстваў. Паводле інфармацыі Міністэрства статыстыкі і аналізу, гэта складае 27,1 працэнта ад агульнай колькасці суб'ектаў гаспадарання. Сума стратаў па іх дасягнула 29,6 трыльёна рублёў. Для параўнання: сума прыбытку, атрыманага прадпрыемствамі і арганізацыямі рэспублікі за гэты ж час, склала 33 трыльёна рублёў.

Найбольшая доля стратных прадпрыемстваў — у сферы сувязі (57,1 працэнта ад агульнай колькасці), невытворчых відах бытавога абслугоўвання насельніцтва (47,3 працэнта), на транспарце (36,5) і ў сельскай гаспадарцы (32,9 працэнта). У прамысловасці гэты паказчык — самы нізкі сярод галін эканомікі (17,6 працэнта).

Сяргей СНЕГІН.

Часова выконваць абавязкі старшыні ценявога ўрада Беларусі будзе Мечаслаў Грыб

З хвіліны маўчання ў памяць аб Генадзю Карпенку — першым старшыні Нацыянальнага выканаўчага камітэта (ценявога ўрада) Беларусі — распачалося чарговае пасяджэнне НВК.

Паколькі, згодна са статутам гэтай арганізацыі, яе старшыня выбіраецца на сходзе дэпутатаў Вярхоўнага Савета, да правядзення такога сходу выконваць абавязкі старшыні НВК даручана аднаму з цяперашніх ягоных намеснікаў — Мечаславу Грыбу. Член прэзідыума НВК Міхаіл Чыгір быў рэкамендаваны ў якасці прадстаўніка ценявога ўраду (замест Генадзя Карпенкі) у Каардынацыйны савет дэмакратычных сіл Беларусі.

Удзельнікі пасяджэння НВК другі раз разгледзелі законапраект "Аб альтэрнатыўнай вайсковай службе". Яшчэ раз было падкрэслена, што пацыфісты на Беларусі зараз знаходзяцца ў бяспраўным стане: у выпадку адмаўлення ад вайсковай службы іх прыцягваюць да крымінальнай адказнасці. Пры гэтым "вілка" прызыву (18—27 гадоў) прыводзіць да таго, што за адзін і той жа ўчынак малады чалавек можа адсядзець у турме некалькі разоў. У выніку абмеркавання вырашана дапрацаваць законапраект і апублікаваць яго ў сродках масавай інфармацыі для ўсенароднага абмеркавання.

Уладзімір ГЛОД, БелаПАН.

Новыя вершы

Мікола ЧАРНЯЎСКІ

Пра мільён і лімон

Быў мільёнам —
Зрабіўся "лімонам".
Што ён важыў —
Раптоўна згубіў:
"Вагаўшчык", відаць,
Быў Саламонам,
Ды не мудрым —
Цяперашнім быў.

Развялося цяпер саламонаў
Ад Крамля да палескай глушы —
Нахапаліся гэтых "лімонаў",
Іх, як "бэраў",
У кожнай душы.

Нам крычаць,
каб не трацілі веры,
А "лімон" ліхаманка трасе...
Хоць па звестках —
Усе мільянеры,
Ды амаль што галодныя ўсе.

Падганяе інфляцыя плёткай:
"Ты, "лімоне",
з аглядкай хадзі..."
Перагналі Амерыку ўсё-ткі —
Мільянераў —
Хоць гаць гаці!

Да даляра,
Што з дурняў смяецца,
Можа, хопіць
хадзіць на паклон?
Родны "зайчык"
Мне шэпча з-пад смецця:
"За мільён свой
ці купіш лімон?"

Як загадана зверху —
Трываю.
А душа —
Як прыходскі амбон:
Ставіць свечку,
Мільён адпявае:
"За мільён свой
Ці купіш лімон?"

Возвращаясь к напечатанному

Белорусские офицеры и военнослужащие создают свой Союз

27 марта с.г. "Народная воля" напечатала статью экс-министра внутренних дел Ю.Захаренко "Наш девиз — честь и достоинство!". В ней говорилось, что образована инициативная группа по созданию Союза белорусских офицеров и военнослужащих.

На днях редакция получила проект Устава создаваемого Союза. Понятно, из-за ограниченности газетной площади нет возможности напечатать его полностью. Но отдельные его пункты считаем целесообразным изложить. В главе "Общие положения" обращают на себя внимание такие концептуальные идеи:

1.1. Союз белорусских офицеров и военнослужащих (СБОВ) — республиканская неправительственная общественно-патриотическая организация, объединяющая на добровольных началах офицеров запаса и отставки, военнослужащих МО, МВД, КГБ, признающих независимость и суверенитет Белорусского государства высшей ценностью, которые объединились для пропаганды и защиты своих гражданских, правовых, политических, экономических, социальных прав и свобод.

...1.5. СБОВ является юридическим лицом, имеет обособленное имущество и самостоятельный баланс, расчетные и иные счета в учреждениях банков, вправе от своего имени приобретать имущественные и неимущественные права, нести обязательства, быть истцом и ответчиком в судах. В случаях, оговоренных Уставом, могут быть юридическими лицами и его организационные структуры.

1.6. СБОВ не отвечает по обязательствам и долгам своих членов, равно как и они не отвечают по его обязательствам и долгам.

...1.8. СБОВ осуществляет свою деятельность на принципах законности, коллегиальности, гласности, самоуправления, хозяйственного расчета.

В главе "Цели и задачи" выделяются такие пункты:

2.1. Основными целями деятельности СБОВ являются:

— реализация и защита гражданских, политических, экономических, социальных, культурных прав и свобод офицеров запаса и в отставке, военнослужащих МО, МВД, КГБ и членов их семей;

— воспитание членов СБОВ на принципах патриотизма, гуманизма, офицерской чести, личного достоинства, высокой нравственности, соблюдения традиций офицерского корпуса и гордости за принадлежность к нему;

— противодействие законными средствами и методами тенденциям сепаратизма, пропаганде насилия, национальной розни и вражды в случае их проявления;

— расширение международных связей и укрепление дружбы между народами;

— поддержка и защита других категорий военнообязанных и членов их семей, ветеранов и инвалидов войны, иных граждан при обращении в СБОВ за помощью;

— активное содействие военно-патриотическому воспитанию молодежи Республики Беларусь в защите суверенитета и независимости страны;

— создание банка данных, содержащего необходимую информацию по экономическим, социальным и иным проблемам офицеров запаса и в отставке, военнослужащих МО, МВД, КГБ и членов их семей;

— оказание моральной, материальной и иной помощи членам СБОВ, военнообязанным и их семьям;

В третьей главе, которая называется "Члены Союза офицеров, их права и обязанности", подчеркивается:

Членство в СБОВ индивидуальное и коллективное.

Индивидуальными членами могут быть совершеннолетние граждане Республики Беларусь — офицеры запаса и в отставке, военнослужащие МО, МВД, КГБ, участвующие в реализации уставных целей и задач, признающие Устав и программы СБОВ, уплачивающие членские взносы.

В члены Союза могут быть приняты офицеры, прапорщики, мичманы и сверхсрочнослужащие, состоящие в запасе или отставке, находящиеся на службе в МО, МВД, КГБ и их подразделениях.


Коллективными членами могут быть организации и объединения офицеров, проходивших службу в МО, МВД, КГБ, других воинских формированиях, создаваемых в соответствии с действующим законодательством.

Коллективные члены участвуют в работе СБОВ через своих представителей.

Если Вы решили принять участие в организации Союза белорусских офицеров и военнослужащих, доработке его уставных документов, сообщаем телефоны для связи с оргкомитетом в г.Минске: **(8017) 226-68-10, 224-05-79, 269-84-99.** В письменном виде можно обращаться по адресу: **г.Минск-90, а/я 11 (для Захаренко Ю.Н., Бородича В.В.).**

Степан КУХАРСКИЙ.

Стоп-кадр





Браславщина. Деревня Околица.

Фото Евгения КОКТЫША.

Барысаўская арганізацыя БСДП (НГ) плануе правесці шэраг пікетаў з патрабаваннем вызвалення з-пад варты кандыдата ў прэзідэнты Беларусі Міхаіла Чыгіра

Барысаўская рэгіянальная арганізацыя Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) плануе правесці напачатку траўня серыю пікетаў з патрабаваннямі вызвалення з-пад варты кандыдата ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Міхаіла Чыгіра. У Барысаўскі гарвыканкам ужо пададзены заяўкі на правядзенне першых дзвюх акцый — 2 і 4 траўня.

Месцам правядзення пікетаў прадстаўнікі БСДП (НГ) абралі цэнтральную плошчу горада ля Дома гандлю. Мяркуецца, што акцыі будуць праходзіць з 16 да 18 гадзін, у іх запланаваны ўдзел да 20 чалавек.

Наталля КУЛАГІНА, БелаПАН.

Здарэнне

На малочна-таварнай ферме калгаса "Першамайскі" Брагінскага раёна ў выніку атручвання загінулі 36 дойных кароў

На малочна-таварнай ферме калгаса "Першамайскі" Брагінскага раёна Гомельскай вобласці ў мінулыя выхадныя адбылося масавае атручванне дойных кароў.

Паведамленне аб гэтым паступіла ў дзяжурную часць раённага аддзела ўнутраных спраў ад галоўнага ветэрынарнага ўрача раёна. Як удалося ўстанавіць, на ферме сапсаваўся вадаправод, з-за чаго кароў паілі вадой з прывезенай цыстэрны. Да гэтага ў ёмістасці знаходзіўся прэпарат гумесол, у якім утрымліваліся таксічныя рэчывы азот і карбамід, прыназначаныя для стымуляцыі росту раслін. Перад запраўкай вадой цыстэрна была дрэнна вымыта, і таму 36 кароў да вечара таго ж дня загінулі.

Як паведаміў карэспандэнту старшыня Брагінскага райвыканкама Рычард Стэфановіч, па наяўных звестках, атручванне кароў адбылося з-за халатнасці, а не наўмысна. На месцы здарэння працуе раённая пракуратура.

Ірына МАКАВЕЦКАЯ.

Не паліце сухую траву!

